**Вернісаж.** Кніжна-мастацкая выстаўка «З казкай па жыцці», прымеркаваная да 90-годдзя з дня нараджэння вядомага ў Беларусі і за межамі краіны кніжнага ілюстратара, станковага графіка Алены Лось (1933—2013), прадстаўлена ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. З імем Алены Лось звязана залатое дзесяцігоддзе беларускай кніжнай ілюстрацыі. Яе работы ўвайшлі ў другі том энцыклапедыі «Савецкая кніжная ілюстрацыя», дзе былі прадстаўлены найлепшыя афарміцелі савецкага часу. Мастачка пакінула багатую творчую спадчыну. Толькі ў фондах НББ захоўваецца каля 200 выданняў, афармленых Аленай Лось, і каля 40 эстампаў. Экспазіцыя будзе працаваць да 10 сакавіка.